Дзяржаўная ўстанова адукацыі
“Вілейская гімназія № 2”

# АПІСАННЕ ВОПЫТУ ПЕДАГАГІЧНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ “ПЕДАГАГІЧНЫЯ АСАБЛІВАСЦІ АРГАНІЗАЦЫІ НАВУКОВА-ДАСЛЕДНІЦКАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ ГІМНАЗІІ

(на матэрыяле беларускай мовы і літаратуры)”

Кажура Віктар Віктаравіч,
настаўнік беларускай мовы
і літаратуры
+ 375 29 774 14 66
e-mail: wilgimn2@gmail.com

## 1. *Інфармацыйны блок*

### 1.1. Назва тэмы вопыту

Педагагічныя асаблівасці арганізацыі навукова-даследніцкай дзейнасці вучняў гімназіі (на матэрыяле беларускай мовы і літаратуры).

### 1.2. Актуальнасць вопыту

Актуальнасць праблемы арганізацыі навукова-даследніцкай дзейнасці вучняў вызначаецца дынамічнасцю развіцця грамадства. Важнейшай адукацыйнай стратэгіяй, скіраванай на падрыхтоўку актыўных выпускнікоў школ, з'яўляецца "ўзмацненне даследніцкага аспекту дзейнасці вучняў" [26, с. 14 ]. Даследніцкая дзейнасць дапамагае рэалізаваць запатрабаванасць чалавека ў новых уражаннях, атрыманні інфармацыі, выступае асновай пазнання свету, людзей, самапазнання, асобаснага развіцця. Ад сфарміраванасці ў чалавека даследніцкай пазіцыі ў многім залежыць яго жыццёвая і прафесійная мабільнасць. Даследніцкая дзейнасць садзейнічае "пашырэнню дыяпазону ведаў, актывізацыі пазнавальнай цікавасці, развіццю ўменняў самастойна знаходзіць і аналізаваць інфармацыю, планаваць сваю дзейнасць, кантраляваць і ацэньваць дзеянні, фарміраваць уласныя меркаванні" [25, с. 11 ].

Найбольш спрыяльныя ўмовы далучэння вучняў да даследніцкай дзейнасці прадстаўляе гімназічная адукацыя. Гімназія павінна выхоўваць інтэлектуалаў. Словы *адкрываць*, *шукаць*, *даследаваць*, *праектаваць* складаюць аснову арганізацыі вучэбнай дзейнасці гімназістаў.

Сензітыўным перыядам для развіцця даследніцкай дзейнасці з'яўляецца падлеткавы ўзрост (Л.І. Божавіч, І.С. Кон, А.В. Мудрык, В.С. Мухіна, Д.І. Фельдштэйн, Д.Б. Эльконін і інш.).

Усё сказанае вышэй мае прамыя адносіны да выкладання беларускай мовы і літаратуры. Вучні паспяхова ўключаюцца ў даследніцкую дзейнасць, калі азнаёмлены з культурнай спадчынай мінулага, дасягненнямі сучаснасці, ўсведамляюць працэсы, якія працякаюць у "дыялогах" культур, іх інтарэсы арыентуюцца на засваенне інтэгратыўных сувязей літаратуры, гісторыі, мовы. Гэта дзейнасць выступае сродкам пераўтварэння малапрадуктыўных і

нецікавых урокаў беларускай мовы і літаратуры ў захапляючыя і выніковыя, дазваляе ўлічваць асабістыя схільнасці вучняў, садзейнічае фарміраванню іх актыўнай пазіцыі ў навучанні, гатоўнасці да самаразвіцця, сацыялізацыі.

Сёння адчуваецца запатрабаванасць педагагічнай грамадскасці ў методыцы вучэбна-даследніцкай работы па беларускай мове і літаратуры. Аналіз навукова-метадычнай літаратуры сведчыць, што праблема арганізацыі даследніцкай дзейнасці вучняў гімназіі на ўроках беларускай мовы і літаратуры не з'яўляецца прадметам спецыяльных педагагічных даследаванняў. Дадзены фактар абумовіў выбар тэмы вопыту.

**1.3. Мэта вопыту**

Распрацоўка механізму арганізацыі даследніцкай дзейнасці вучняў гімназіі па беларускай мове і літаратуры.

**1.4. Задачы вопыту**

1. Вывучыць метадычную літаратуру і педагагічны вопыт па арганізацыі навукова-даследніцкай дзейнасці вучняў.

2. Абгрунтаваць неабходнасць даследавання праблемы арганізацыі даследніцкай дзейнасці вучняў гімназіі па беларускай мове і літаратуры.

3. Выявіць і сістэматызаваць ўмовы павышэння эфектыўнасці даследніцкай дзейнасці вучняў гімназіі.

4. Распрацаваць механізм арганізацыі даследніцкай работы вучняў гімназіі па беларускай мове і літаратуры.

**1.5. Працягласць работы над вопытам**

Сістэмная работа па арганізацыі навукова-даследніцкай дзейнасці вучняў гімназіі па беларускай мове і літаратуры вядзецца з 2005 года. У ходзе работы была вывучана нарматыўная і прававая дакументацыя, навукова-метадычная і псіхалагічная літаратура па тэме. Пройдзена курсавая падрыхтоўка ў Мінскім абласным інстытуце развіцця адукацыі, наведаны шматлікія тэматычныя семінары (абласныя, рэспубліканскія і міжнародныя). Праведзены аналіз вынікаў педагагічнай дзейнасці, абагулены і трансліраваны для грамадскасці вопыт (на метадычных аб'яднаннях, семінарах рознага ўзроўню, у

публікацыях), абаронена магістарская праца “Педагагічныя асаблівасці арганізацыі навукова-даследніцкай дзейнасці вучняў гімназіі (на матэрыяле беларускай мовы і літаратуры)”.

## *2. Апісанне тэхналогіі вопыту*

### 2.1. Вядучая ідэя вопыту

Накірункі даследніцкай дзейнасці вучняў гімназіі па беларускай мове і літаратуры, даследніцкая кампетэнтнасць, даследніцкая краязнаўчая работа, працэс арганізацыі даследніцкай работы вучняў, кіраванне даследніцкай дзейнасцю вучняў складаюць аснову дадзенай сістэмы педагагічнай дзейнасці, у якой абгрунтавана неабходнасць вывучэння праблемы арганізацыі даследніцкай дзейнасці вучняў гімназіі па беларускай мове і літаратуры; выяўлены ўмовы павышэння эфектыўнасці даследніцкай дзейнасці; распрацаваны механізмы арганізацыі даследніцкай работы вучняў гімназіі па беларускай мове і літаратуры. Прадстаўленыя матэрыялы могуць шырока выкарыстоўвацца педагагічнай грамадскасцю.

### 2.2. Апісанне сутнасці вопыту

2.2.1. Стан праблемы арганізацыі даследніцкай дзейнасці вучняў у педагагічнай навуцы

Самае ранняе выражэнне ідэі даследавання як метаду спасціжэння свету і метаду навучання знаходзім у старажытнагрэчаскага філосафа Сакрата. У дыялогах Сакрата з яго сучаснікамі даследаваліся маральныя катэгорыі: дабро і зло, свабода і адказнасць і інш. Навуковыя распрацоўкі Сакрата знайшлі працяг у тэорыі і практыцы навучання. Генезіс праблемы арганізаціі даследніцкай дзейнасці вучняў адлюстроўвае табліца 1 (гл. Дадатак 2. Табліца 1).

Напрацоўкі беларускіх вучоных па праблеме арганізацыі даследніцкай дзейнасці вучняў прадстаўлены даволі слаба (С.Ю. Галакціёнава [5], Б.В. Запрудскі [10], Л.А. Казінец [16; 20; 21], М.С. Крывалап [22], В.М. Траблоўская [28], С.А. Цітова [27]). У асноўным гэта працы метадыстаў гарадскога і абласных інстытутаў развіцця адукацыі, настаўнікаў-практыкаў. Аспекты навучання школьнікаў на даследніцкай аснове на ўроках мовы і

літаратуры расрацоўваюць І.М. Гоўзіч [7], М.Г. Качурын [17], І.Л. Барзенка [7]. Аўтары адзначаюць, што толькі пры даследніцкім падыходзе вывучэнне мовы дасць запас карысных у практычных адносінах і цікавых ведаў і ўменняў, прывучыць да самастойнага мыслення, будзе развіваць розум. М.Г. Качурын у працы "Арганізацыя даследніцкай дзейнасці на ўроках літаратуры" прапаведуе ідэю даследавання на ўроках літаратуры. [17]. І.М. Гоўзіч і І.Л. Барзенка ў кнізе "Шукаем шэдэўры!" адлюстроўваюць віды і формы навукова-даследніцкай работы па літаратуры, прадстаўляюць узоры яе афармлення [7].

2.2.2. Сутнасць, структура і функцыі даследніцкай дзейнасці ў адукацыйным працэсе ўстановы адукацыі

Для ажыццяўлення навучання на даследніцкай аснове педагогу неабходна разабрацца ў сутнасці даследніцкай дзейнасці. Нам імпануе меркаванне А.У. Леантовіча, які пад даследніцкай дзейнасцю разумее "дзейнасць вучняў, звязаную з рашэннем імі (вучнямі) творчай, даследніцкай задачы з папярэдне невядомым рашэннем, якая патрабуе наяўнасці асноўных этапаў, характэрных для даследавання ў навуковай сферы: пастраноўку праблемы, вывучэнне тэорыі, звязанай з выбранай тэмай, выпрацоўку гіпотэзы даследавання, падбор методык і практычнае авалоданне імі, збор уласнага матэрыялу, яго аналіз і абагульненне, уласныя вывады, прадстаўленне выкананай работы" [15, с.10].

Абапіраючыся на погляды метадыстаў і ўласныя практычныя памкненні, мы прыйшлі да вываду, што адукацыйны патэнцыял даследніцкай дзейнасці выражаецца ў праяўленні схаваных магчымасцей яе суб'ектаў: манеры паводзін, ведаў, адносін, форм трансляцыі вопыту, жыццёвых каштоўнасцей.

Навуковы пошук прывёў нас да думкі пра мэтазгоднасць прадстаўлення патэнцыялу даследніцкай дзейнасці праз аналіз яе функцый ў адукацыйным працэсе. Аналіз даследаванняў псіхолагаў і метадыстаў, уласны вопыт работы дазволіў выдзеліць наступныя *функцыі даследніцкай дзейнасці*: *рэфлексіўную* (асэнсаванне набытага вопыту); *пабуджальную* (вызначэне характару матывацыі да ўдасканалення); *светапоглядную* (стварэнне навуковай карціны свету, папаўненне яе прынцыпамі, у якіх абагулены маральны вопыт людзей);

*пазнавальную* (самастойнае набыццё ведаў); а*рыентацыйную* (фарміраванне ўяўленняў пра мэты і сродкі ажыццяўлення дзеянняў).

Рэалізаваць пералічаныя функцыі дазваляюць *кампаненты* даследніцкай дзейнасці: к*аштоўнасна-мэтавы* (выдзяляецца пабуджальнай функцыяй, вызначаецца здольнасцю вучняў ўключацца ў даследніцкую дзейнасць, авалодваючы спосабамі рашэння задач); і*нтэлектуальна-творчы* (выдзяляецца светапогляднай функцыяй, вызначаецца здольнасцю вучняў выкарыстоўваць атрыманую інфармацыю); *аперацыйны* (выдзяляецца пазнавальнай функцыяй, выражаецца сфарміраванасцю даследніцкіх уменняў); *вынікова-ацэначны* (выдзяляецца арыентацыйнай функцыяй, вызначае адэкватнасць выконваемай працэдуры даследавання, адпаведнасць атрыманых вынікаў прагназуемым).

Аналіз педагагічнай літаратуры сведчыць аб крайне рэдкім выкарыстанні паняцця "*навукова-даследніцкая дзейнасць вучняў*". Гэты факт тлумачыцца тым, што навукова-даследніцкая дзейнасць можа ажыццяўляцца толькі высокакваліфікаванымі кадрамі. Для яе патрабуецца абсталяванне, лабараторыі. Над многімі сусветнымі праблемамі навукі працуюць навукова-даследчыя інстытуты. Вучні не могуць арганізаваць навуковую дзейнасць. Яны могуць далучыцца да свету навуковага пазнання праз тыя віды вучэбнай дзейнасці, якія магчыма ажыццявіць у рамках навучальных установ. Таму мэтазгодна выкарыстоўваць паняцце "*вучэбна-даследніцкая дзейнасць вучняў*".

Арганізоўваць вучэбна-даследніцкую дзейнасць вучняў трэба з апорай на шэраг *прынцыпаў*: *даступнасці* (здольнасць дзіцяці выконваць заданне); *натуральнасці* (праблема павінна быць рэальнай, а не надуманай); *эксперыментальнасці* (пазнанне вучнямі ўласцівасцей чаго-небудзь шляхам задзейнічання ўсіх аналізатараў); *асэнсаванасці* (праблемы, мэты, задач, ходу самога даследавання і яго вынікаў); *адпаведнасці культуры* (улік традыцый успрыняцця свету, якія існуюць у дадзенай культуры); *самастойнасці* (вучань авалодвае ходам даследавання і новымі ведамі праз вопыт самастойнай работы) [29]; *даступнасці інфармацыі* ("узнаўленне вядомых вопытаў без змянення мэты і методыкі іх правядзення даследаваннем лічыцца не будзе" [29, с. 118]).

Мая пазіцыя адносна арганізацыі даследніцкай дзейнасці вучняў выдзяляе наступныя *ўмовы эфектыўнасці*: добраахватнае (вучня і настаўніка) жаданне правядзення даследавання; магчымасць даследавання; задавальненне ад работы. Пры арганізацыі даследніцкай дзейнасці педагогу даводзіцца сутыкацца з рэаліямі: няма гатовых эталонаў ведаў; шэраг абмежаванняў накладваюць на тэматыку, характар і аб'ём даследаванняў патрабаванні ўзроставай псіхалогіі, праблемы практычнага выкарыстання атрыманых вынікаў; часавыя рамкі выканання даследніцкай работы; захаванне аўтарскіх правоў.

Настаўнік павінен ведаць *тыпы даследніцкіх работ вучняў*: *праблемна-рэфератыўныя* – творчыя работы на аснове некалькіх літаратурных крыніц, якія дапускаюць супастаўленне дадзеных крыніц і на аснове гэтага ўласнае тлумачэнне праблемы; *натуралістычныя і апісальныя* – творчыя работы, скіраваныя на назіранне і якаснае апісанне з'явы; *даследніцкія* – творчыя работы, што маюць уласны эксперыментальны матэрыял, на аснове якога робіцца аналіз і вывады аб характары даследуемай з'явы; *эксперыментальныя* – творчыя работы, напісаныя на аснове выканання эксперыменту, які апісаны ў навуцы і мае вядомы вынік; *праектная дзейнасць* – гэта творчая дзейнасць, скіраваная на дасягненне пэўнага выніку, стварэнне прадукту [23].

Педагогі, якія арганізуюць у школе даследніцкую дзейнасць вучняў, павінны: займацца самаадукацыяй; мець актыўную педагагічную пазіцыю, імкненне да даследніцкай дзейнасці; умець прагназаваць перспектыву дзейнасці, адчуваць праблемнасць сітуацый, з якімі сутыкаюцца вучні; умець ставіць рэальныя задачы ў зразумелай форме; умець наладжваць дзелавыя зносіны з вучнямі і дыягнасціраваць творчыя здольнасці; садзейнічаць прадаўжэнню вучнямі навукова-даследніцкай дзейнасці [2].

На аснове вышэй сказанага, можна зрабіць *вывад*, што арганізаваць даследніцкую дзейнасць вучняў у школе можна толькі пры ўмове, калі ў яе суб'ектаў (настаўнікаў і вучняў) сфарміраваны даследніцкія кампетэнцыі і ёсць высокая зацікаўленасць да пазнання і творчая актыўнасць.

2.2.3. Вопыт арганізацыі даследніцкай дзейнасці вучняў Вілейскай гімназіі № 2 на ўроках беларускай мовы і літаратуры

Асноўнае прызначэнне настаўніка беларускай мовы і літаратуры заключаюцца ў выхаванні вучняў "з глыбока гуманістычным і дэмакратычным светапоглядам, самастойным мысленнем, з развітым, высокакультурным пачуццём нацыянальнай і асабістай самапавагі, чуйных да сацыяльнага паліфанізму жыцця, разважлівых патрыётаў, адданых агульначалавечым ідэалам" [4, с. 8]. Выхаванне асобы з такім шырокім дыяпазонам якасцей цяжка ўявіць па-за ўцягненнем яе ў даследніцкую дзейнасць.

Пошукі настаўнікаў мовы і літаратуры так ці інакш звязаны з даследаваннем як вядучым пачаткам выкладання. Сучасная сітуацыя дае для гэтага шырокія магчымасці: вяртанне невядомых раней літаратурных твораў, перагляд ідэйна-эстэтычных пазіцый твораў. Навучэнцы здольны ўбачыць у знаёмым тэксце незаўважанае дагэтуль. Таму даследніцкую работу на ўроках беларускай мовы і літаратуры мэтазгодна разглядаць як метад і як узровень, да якога ў ідэале могуць узняцца многія віды работы старшакласнікаў.

Мова з'яўляецца першаэлементам літаратуры. Каб вылучаць ідэйны змест твора, яго (гэты твор) неабходна разумець. Вучняў неабходна навучыць праводзіць лінгвістычны аналіз мастацкага тэксту. На ўроках беларускай мовы настаўнік павінен: а) даць вучням неабходныя веды пра найважнейшыя моўныя асаблівасці тэксту, навучыць даследаваць моўныя сродкі літаратурнага твора і выпрацаваць уменне бачыць моўнае майстэрства пісьменніка; б) навучыць выяўляць і тлумачыць цяжкія для ўспрымання моўныя з'явы (архаізмы, дыялектызмы, аказіяналізмы, сінонімы, перыфразы, фразеалагізмы і інш.), звяртаць увагу на граматычныя і фанетычныя асаблівасці; в) падрыхтаваць вучняў да лінгвістычнага каменціравання мастацкіх тэкстаў [28]. Лінгвістычны аналіз адных тэкстаў дазваляе выявіць і ахарактарызаваць моўныя з'явы, другіх – зрабіць цэласны аналіз мовы твора.

Арганізацыю ўрокаў беларускай літаратуры на аснове літаратурнага даследавання прапаную разгледзець на прыкладзе вывучэння рамана

У. Караткевіча “Каласы пад сярпом тваім” (гл. Дадатак 1). Настаўнік даследуе мастацкі тэкст, які можа адкрыцца перад вучнямі ў нязведанай якасці; даследуе мастацкае ўспрыманне, уласцівае моладзі і адметнае для кожнага пакалення, для класа, для асобнага вучня.

Вучэбныя заняткі па беларускай мове і літаратуры будуюцца на аснове абагульненай мадэлі ўрока, сэнсавае ядро якой складаюць этапы: матывацыйны, пастаноўка вучэбнай задачы (даследніцкае заданне), рашэнне вучэбнай задачы (выкананне задання), рэфлексія. Урок-дыскусія, урок-пошук, урок-даследаванне ператваралі вучэбныя заняткі ў мікрадаследаванне. На занятках выкарыстоўваецца сістэма асобасна-арыентаваных даследніцкіх заданняў, якія дапамагаюць мадэляваць рэальнасць, садзейнічаюць напаўненню вучэбнага зместу асобасным сэнсам, выяўляюць несупадзенне ўяўленняў і меркаванняў, ствараюць сітуацыю выбару, скіраваны на сустрэчу з Асобай, прадугледжваюць супрацоўніцтва і сатворчасць.

У працэсе выпрацоўкі дадзенай сістэмы вопыту быў сфарміраваны комплекс сродкаў навучання: ілюстратыўныя і дыдактычныя матэрыялы, неабходныя для арганізацыі дзейнасці вучняў па самастойным “пераадкрыцці” ведаў; адабраны методыкі правядзення даследніцкіх работ. Пасля аналізу метадычнай літаратуры і прымянення набытых ведаў аўтарам сістэмы зроблены *высновы*: вялікую ролю ў навучанні адыгрываюць звязныя тэксты, якія даюць матэрыял для моўнай практыкі, выражаюць закончаную думку, дазваляюць паказаць крыніцу інфармацыі, слоўнік, усе віды маўленчай дзейнасці, рашаюць адукацыйныя і выхаваўчыя мэты. У час работы з тэкстам выкарыстоўваем усе віды лінгвістычнага аналізу: фанетычны, лексічны, марфемны і этымалагічны, марфалагічны і сінтаксічны. Для правядзення аналізу тэксту распрацаваны памяткі (напрыклад, гл. Дадатак 3. Памятка “Лексічны аналіз тэксту”).

Для дасягнення максімальнага выніку *пры стварэнні* вучнямі эксперыментальных (уласных) *тэкстаў* мэтазгодна карыстацца наступнымі *прыёмамі*: выдаленне з тэксту пэўнай моўнай з’явы (напрыклад, убраць з тэксту ўсе прыметнікі); замена пэўнага моўнага элемента сінанімічным (напрыклад, у

тэксце адно слова замяняецца другім); разгортванне тэксту (садзейнічае разуменню тэксту); згортванне тэксту (дапамагае выявіць мастацкія сродкі вобразнасці); перастаноўка слоў і другіх моўных адзінак; парушэнне сувязей паміж кампанентамі тэксту (абзацамі, сказамі, словамі, гукамі); параўнанне некалькіх аўтарскіх рэдакцый.

Плённа праходзілі ўрокі беларускай мовы, на якіх спалучаўся праграмны і краязнаўчы матэрыял. Мясцовы матэрыял выкарыстоўваўся як для аналізу, так і для запісу рознага роду прыкладаў.

2.2.4. Спецыфіка даследніцкай дзейнасці вучняў гімназіі ў пазаўрочнай рабоце. Літаратурнае краязнаўства

Шматгадовы вопыт работы ў гімназіі пераконвае ў тым, што арганізацыя даследніцкай дзейнасці на ўроках суправаджаецца цяжкасцямі: затраты вучэбнага часу, дыферэнцыраваны падыход да вучняў, непадрыхтаванасць асобных вучняў да правядзення даследавання. Іх можна пазбегнуць, калі даследніцкую дзейнасць перанесці на пазаўрочны час (факультатывы, гурткі, клубы, навуковае таварыства “Пошук”, якое дзейнічае ў Вілейскай гімназіі № 2, і г. д.). Ідэальны варыянт – спалучэнне ўрочнай і пазаўрочнай работы.

У Вілейскай гімназіі № 2 назапашаны значны вопыт спалучэння ўрочнай і пазаўрочнай работы шляхам школьнага краязнаўства. Асаблівасць школьнага краязнаўства – грамадская скіраванасць, а таксама пошукава-даследніцкі характар. Даследніцкая работа па беларускай мове і літаратуры ў галіне краязнаўства абапіраецца на асабістыя назіранні вучняў за жыццём і побытам насельніцтва, выводзіць вучняў у свет акаляючай рэчаіснасці, пашырае назіральнасць і вучыць удумліваму стаўленню да грамадскіх з’яў. На пачатку працы над краязнаўчай тэмай ставіцца праблема – прадмет вывучэння, вызначаюцца яго сувязі з раней засвоеным як на ўроках беларускай мовы і літаратуры, так і ўроках па іншых вучэбных прадметах. Затым выпрацоўваецца алгарытм вывучэння тэмы, даюцца індывідуальныя і комплексныя заданні. У канцы працы падводзяцца вынікі, улічваюцца ўдзел і поспехі кожнага вучня.

Пазаўрочная работа цікавая тым, што скіравана на развіццё творчага, крытычнага мыслення гімназістаў. Яна прыцягвае разнастайнасцю відаў і форм: увядзеннем літаратурнага краязнаўства праз пазакласнае чытанне ў сістэму ўрокаў па літаратуры; зборам звестак, падрыхтоўкай паведамленняў (рэфератаў) пра пісьменнікаў, чыё жыццё звязана з Вілейшчынай; супрацоўніцтвам з Вілейскім краязнаўчым музеем і бібліятэкамі; даследніцкай работай (стварэнне праектаў, падрыхтоўка вучняў да ўдзелу ў конкурсах даследніцкіх работ); пасяджэннямі літаратурнай гасцёўні “На Парнасе” (сустрэчы з мясцовымі паэтамі і пісьменнікамі); падарожжамі па літаратурных і культурных мясцінах Беларусі.

У ходзе праведзенага мікрадаследавання сярод вучняў Вілейскай гімназіі № 2 выявіліся прычыны ўдзелу гімназістаў у даследніцкай краязнаўчай рабоце: цікавасць да вывучаемай на ўроках праблемы (14,7%); атрыманне дадатковых ведаў (24,3%); магчымасць павышэння адзнак па мове і літаратуры (11,4%); магчымасць навучыцца лагічна мысліць (5,3%); творчыя зносіны (4,6%); імкненне глыбей пазнаёміцца з гісторыяй і культурай роднага краю (31,5%); падрыхтоўка да паступлення ва ўніверсітэт (12,8%). У ходзе маніторынгу выніковасці навукова-даследніцкай работы гімназістаў былі выяўлены наступныя тыповыя памылкі юных даследчыкаў: адсутнасць праблемы ў назве работы; неадпаведнасць тэмы і зместу; недастатковае абгрунтаванне актуальнасці; слабы аналіз літаратуры па праблеме; некарэктнае выкарыстанне тэрміналогіі; адсутнасць абгрунтаваных вывадаў; парушэнне патрабаванняў пры складанні бібліяграфіі; неадпаведнасць афармлення работы патрабаванням.

Даследаванне, праведзенае сярод старшакласнікаў, дазволіла зрабіць вывад, што ў гімназіі неабходна стварыць сістэму, якая дазваляе кожнаму вучню набыць вопыт даследніцкай дзейнасці. Далучэнне да даследніцкай дзейнасці павінна адбывацца ў некалькі этапаў (гл. ДАДАТАК 4. Табліца 2).

Далучэнне юных даследчыкаў да заказаў гімназіі, раёна ажыццяўляецца цераз пошук магчымасці выкарыстання вынікаў даследніцкіх работ у гімназіі (выстаўка, інфармацыйны банк работ, выкарыстанне работ у педагагічным

працэсе, стэнд “Лепшыя юныя даследчыкі гімназіі” і г.д.). Гімназісты даследуюць праблемы наймення вуліц горада Вілейкі, тапонімы і мікратапонімы прылеглых да Вілейкі вёсак, тапонімы і мікратапонімы вёсак, затопленых у час будаўніцтва Вілейска-Мінскай воднай сістэмы, культурную спадчыну Вілейшчыны, гісторыю ўзнікнення прадпрыемстваў у горадзе і раёне, вывучаюць жыццё і творчасць вядомых людзей (гл. Дадаткі 5, 7, 8).

Распрацоўка механізму арганізацыі даследніцкай краязнаўчай работы старшакласнікаў гімназіі па беларускай мове і літаратуры пацвердзіла мэтазгоднасць стварэння банка перспектыўных накірункаў вучэбна-даследніцкай дзейнасці гімназістаў; арганізацыі спецыяльных заняткаў для навучэнцаў, якія займаюцца даследаваннямі; ажыццяўлення маніторынгу ўдзелу ў даследніцкай дзейнасці і яе выніковасці.

Механізм арганізацыі даследніцкай краязнаўчай работы па беларускай мове і літаратуры ў Вілейскай гімназіі № 2 поўнасцю сябе апраўдаў. Пра гэта сведчаць дасягненні і вынікі даследніцкай дзейнасці і тэматыка вучнёўскіх работ (гл. Дадатакі 7, 8).

### *3. Заключэнне*

Такім чынам, *аб’ектам* прадстаўленай сістэмы вопыту з’явілася даследніцкая дзейнасць вучняў гімназіі, а *прадметам* – працэс арганізацыі даследніцкай дзейнасці вучняў гімназіі па беларускай мове і літаратуры. Аўтар прадстаўленай сістэмы педагагічнага вопыту абапіраўся на аналіз навуковай літаратуры па праблеме, зрабіў сістэматызацыю матэрыялу, вёў назіранні, гутаркі, апытанні, карыстаўся метадам матэматычнай статыстыкі.

*Вынікі* працы: вывучана метадычная літаратура і педагагічны вопыт па арганізацыі навукова-даследніцкай дзейнасці вучняў; абгрунтавана неабходнасць даследавання праблемы арганізацыі даследніцкай дзейнасці вучняў гімназіі па беларускай мове і літаратуры; выяўлены і сістэматызаваны ўмовы павышэння эфектыўнасці даследніцкай дзейнасці вучняў гімназіі. *Элемент навізны сістэмы вопыту* у тым, што распрацаваны механізм

арганізацыі даследніцкай работы вучняў гімназіі па беларускай мове і літаратуры.

Сістэматызаваныя і цэласна прадстаўленыя матэрыялы могуць шырока выкарыстоўвацца настаўнікамі беларускай мовы і літаратуры, а таксама выкладчыкамі ўстаноў вышэйшай адукацыі і каледжаў. Матэрыялы вопыту адлюстраваны ў 5 *публікацыях* (гл. Дадатакі 7, 9). *Доказам выніковасці* вопыту з’яўляюцца дасягненні вучняў (гл. Дадатак 7)

Аўтар работы пацвярджае, што прыведзены ў ёй разлікова-аналітычны матэрыял аб’ектыўна адлюстроўвае стан даследуемага працэсу, а ўсе запазычанні з літаратурных і іншых крыніц, метадалагічныя і метадычныя палажэнні і канцэпцыі суправаджаюцца спасылкамі на іх аўтараў.

З апісання і практычнага прымянення сістэмы вопыту можна зрабіць наступныя *высновы*:

1. Праблема арганізацыі навукова-даследніцкай дзейнасці вучняў з’ўляецца адной з важнейшых у сучаснай педагагічнай навуцы і практыцы. Дынамічнасць развіцця грамадства абумоўлівае неабходнасць праяўлення даследніцкіх паводзін асобы. Даследніцкая дзейнасць валодае вялікім адукацыйным патэнцыялам.

2. Ідэю даследавання як метаду спасціжэння свету і метаду навучання адным з першых выказаў грэчаскі філосаф Сакрат. Яго навуковыя распрацоўкі знайшлі працяг у працах Ф.А. Дзістэрвега, Дж. Дзьюі, Дж. Лока, І.Г. Песталоцы, Ж.Ж. Русо, А.М. Талстога, К.Д. Ушынскага. На сучасным этапе праблема знаходзіць адлюстраванне ў працах М.У. Кларына, А.У. Леантовіча, А.С. Обухава, А.І. Савенкава, А.В. Цягловай, беларускіх вучоных Б.В. Задворнага, М.І. Запрудскага, Л.А. Казінец, В.М. Трублоўскай і інш. Але ў працах гэтых вучоных не разглядаецца пытанне арганізацыі даследніцкай дзейнасці вучняў на ўроках беларускай мовы і літаратуры.

3. Сучасныя ўстановы адукацыі маюць шырокія магчымасці ўключэння вучняў у даследніцкую дзейнасць. Найбольш спрыяльныя ўмовы для далучэння да такога віду дзейнасці прадстаўляе гімназія.

4. Арганізаваць даследніцкую дзейнасць вучняў у адукацыйным працэсе гімназіі можна толькі пры ўмове, калі ў суб'ектаў гэтай дзейнасці на адпаведным узроўні будуць сфарміраваны даследніцкія кампетэнцыі.

5. Даследніцкая дзейнасць вучняў на ўроках мовы і літаратуры зводзіцца перш за ўсё да аналізу тэкстаў мастацкіх твораў.

6. Арганізацыя даследніцкай работы на ўроках беларускай мовы і літаратуры суправаджаецца пэўнымі цяжкасцямі. Іх можна пазбегнуць, калі спалучаць вучэбную даследніцкую дзейнасць з пазаўрочнай работай. Адзін са шляхоў спалучэння – школьнае краязнаўства.

7. Рэалізацыя механізмаў далучэння вучняў да даследніцкай дзейнасці прадэманстравала неабходнасць распрацоўкі перспектыўных накірункаў навукова-даследніцкай дзейнасці вучняў, арганізацыі спецыяльных заняткаў для вучняў, ажыццяўлення маніторынгу выніковасці даследніцкай дзейнасці.

8. Практыка сведчыць, што даследніцкая дзейнасць вучняў гімназіі ажыццяўляецца найбольш эфектыўна пры захаванні наступных умоў: 1) стварэнне асяроддзя, якое стымулюе творчы пошук і асобаснае развіццё вучня; 2) псіхалагізацыя даследніцкай дзейнасці вучняў; 3) павышэнне даследніцкай кампетэнтнасці педагогаў і вучняў; 4) распрацоўка комплекса сродкаў навучання даследніцкага характару; 5) арганізацыя краязнаўчай даследніцкай работы; 6) далучэнне юных даследчыкаў да заказаў гімназіі, раёна.

**Спіс літаратуры**

1. Безрукова, В.С. Директору об исследовательской деятельности школьников / В.С. Безрукова. – М.: Сентябрь, 2002. – 159 с.

2. Вишневская, Л.Л. Исследовательская деятельность учащихся гимназии как средство реализации их индивидуальной образовательной траектории: автореф. дисс. … канд. пед наук: 13.00.01 / Л.Л. Вишневская. – Ярославль. – 2008. – 18 с.

3. Галактионова, С.Ю. Формирование исследовательских и конструктивных умений учащихся на уроках и во внеурочной деятельности / С.Ю. Галактионова // Роль педагога в работе с одаренной молодежью:

материалы республиканской научно-практической конференции, Минск, 20 мая 2010 г. / ГУО «АПО». – Минск: АПО, 2010. – 403 с.

4. Гоўзіч, І.М. Шукаем шэдэўры!: вопыты літаратурных даследаванняў / І. М.Гоўзіч, І.Л. Шаўлякова-Барзенка. – Мінск: Нац. ін-т адукацыі, 2010. – 84 с.

5. Запрудский, Н.И. Современные школьные технологии – 2 / Н.И. Запрудский. – 2-е изд. – Минск. – Сэр-Вит, 2012. – 251 с.

6. Ишкова, А.Э. Педагогические условия развития исследовательской компетентности учащихся в системе начального профессионального образования: автореф. дисс. … канд. пед наук: 13.00.01 / А.Э. Ишкова. – Иркутск. – 2008. – 22 с.

7. Казінец, Л.А. Новыя далягляды даследчыцкай дзейнасці вучняў / Л.А. Казінец // Адукацыя і выхаванне. – 2009. – № 8. – С. 3 – 7.

8. Качурин, М.Г. Организация исследовательской деятельности учащихся на уроках литературы: Книга для учителя / М.Г. Качурин. – М.: Просвещение, 1998. – 173 с.

9. Козинец, Л.А. Исследовательская деятельность учащихся / Л.А. Козинец // Адукацыя і выхаванне. – 2003. – № 1. – С. 19 – 21.

10. Козинец, Л.А. Организация работы с одарёнными детьми в гимназии / Л.А. Козинец // Адукацыя і выхаванне. – 2008. – № 1. – С. 35 – 38.

11. Криволапова, Н.А. Организация научно-исследовательской деятельности учащихся / Н.А. Криволапова. – Курган, 2004. – 79 с.

12. Леонтович, А.В. К проблеме исследований в науке и в образовании / А.В. Леонтович // Развитие исследовательской деятельности учащихся: Методический сборник. – М.: Народное образование, 2001. – С. 33-37.

13. Лестева, Е.В. Педагогическое сопровождение исследовательской деятельности учащихся в процессе преподавания гуманитарных дисциплин: дисс. канд. пед наук: 13.00.01 / Е.В. Лестева. – Смоленск. – 2009. – 19 с.

14. Проказова, О.Г. Организация исследовательской деятельности учащихся: автореф. дисс. … канд. пед наук: 13.00.01 / О.Г. Проказова. – Астрахань. – 2010. – 24 с.

15.Титова, С.А. Поисково-исследовательская деятельность учащихся и педагогов Минской области по изучению родного края / С.А. Титова / Образование взрослых: история, современность, перспективы развития. – Минск: МОИРО, 2011. – 265 с.

16.Трубловская, О.М. Практика организации научно-исследовательской деятельности учащихся в общеобразовательной школе / О.М. Трубловская / Поддержка одаренности – развитие активности: материалы международного конгресса, Витебск, 22 – 27 сентября 2014 г.: в 2 т. / Вит. гос. ун-т; редкол.: И.М. Прищепа (гл. ред.), О.Грауманн, М.Н. Певзнер. – Витебск: ВГУ им. П.М. Машерова, 2014. – Т. 1. – С. 324.

17.Тяглова, Е.В. Исследовательская деятельность учащихся по химии / Е.В. Тяглова. – 2-е изд., стереотипное. – М.: Глобус, 2007. – 223 с.

## Дадатак 1. Сістэма заняткаў па рамане У. Караткевіча “Каласы пад сярпом тваім”

Сістэма заняткаў па рамане У. Караткевіча

“Каласы пад сярпом тваім”

1. У. Караткевіч у рабоце над раманам. Прычыны звароту да тэмы паўстання 1863 г. гісторыя стварэння рамана і асаблівасці яго пабудовы. “Геаграфія” рэальная і мастацкая. Сувязь месца і часу у мастацкім апавяданні.

2. Жыццёвыя назіранні і гістарычныя факты – аснова для стварэння вобразаў рамана. Сувязь і ўзаемадзеянне персанажаў. Супрацьстаянне высакароднага і ганебнага ў адлюстраванні шляхты.

3. Стыхія сялянскага жыцця ў рамане. Дыялектыка паняццяў “сялянства” і “народ”. Народная аснова твора. Аўтарскія адносіны да таго, што адлюстроўваецца.

4. Гістарычныя асобы ў рамане, іх месца, сувязь з іншымі вобразамі. Адзінства праўдзівасці і мастацкага вымыслу ў вобразах гістарычных асоб. Аўтарская пазіцыя адносна іх.

5. Вобраз Алеся Загорскага як плён пошукаў У. Караткевічам ідэальнага героя; спалучэнне рамантычнага і прагматычнага ў асобе героя. “Вечнасць” вобразаў, створаных пісьменнікам.

6. Духоўнае аблічча аўтара і праўда мастацтва, якая раскрывае рух жыцця, сувязь мінулага, сучаснага і будучага, паказвае на гістарычным фоне заканамернасць лёсу чалавека, лёсу народа.

Асноўны напрамак работы па творы – ад факта да вобраза. Гэтаму спрыяюць два віды даследчыцкіх заданняў: каментарыі да тэксту і даклады навучэнцаў пра асобныя моманты творчай гісторыі рамана. Каментарыі спецыялізіруюцца на шырокім коле пытанняў: па храналогіі, па гістарычных імёнах, што згадваюцца ў творы, па слоўніках, па геаграфіі, па эпіграфах, па фальклорных крыніцах, выкарыстаных у рамане, і інш. Тэмы дакладаў спрыяюць раскрыццю на найбольш яркіх прыкладах сутнасці работы аўтара над жыццёвым матэрыялам.

Заняткі, прысвечаныя вобразам вымышленых і гістарычных асоб, прасякнуты адной ідэяй: усе асобы – плён мастацкай фантазіі пісьменніка. У кожнай з іх жыццёвыя факты, назіранні, уражанні пераўтвораны ў жывы чалавечы характар. У гэтым сэнсе ўсе гістарычныя асобы вымышленыя, бо У. Караткевіч уявіў сабе, як яны маглі думаць і дзейнічаць у пэўных абставінах (напрыклад, эпізод у гасцёўні Адама Кіркора), а ўсе вымышленыя героі – гістарычныя, бо адпавядаюць духу часу, у якім яны змешчаны воляй аўтара.

Ідэйны змест эпізода і яго вобразнае ўвасабленне знайшлі максімальнае выяўленне ў форме ролевай гульні. У творчую групу па даследаванні тэксту ўвайшлі гісторык, літаратуразнаўца, чытальнікі, вядучы. Вядучы падрыхтаваў пачатак гутаркі, які стымуляваў актыўнасць яе ўдзельнікаў – слухачоў. Гісторык тлумачыў даты, падзеі, ролю рэальных асоб у гісторыі беларускай культуры. Літаратуразнаўца каменціраваў спосабы выражэння аўтарскай думкі, раскрываў ролю мастацкіх прыёмаў у абмалёўцы герояў, звяртаў увагу аўдыторыі на асаблівасці выкарыстання і трактоўкі гістарычнага матэрыялу. Кожны ўдзельнік ролевай гульні меў “групу падтрымкі”, да якой звяртаўся па дапамогу.

Зварот да нестандартнай формы заняткаў сведчыць, што вымысел у У. Караткевіча мае цвёрды гістарычны грунт. Паказ унутранага свету, адносін, размоў – усё гэта прыдумана пісьменнікам, але прыдумана ў духу праўды: мастак на аснове таго, што яму вядома, здагадваецца пра тое, чаго не было, але што магло быць і нават павінна было быць у тых абставінах. Таму нават вымышленая гутарка з прыдуманым субяседнікам здольна стварыць уражанне жывой, пераканаўчай праўды” [28].

Пасля “прысваення” вучнямі мастацкага твора, якое заключаецца ў высвятленні першапачатковых уражанняў ад прачытанага рамана, прыступаю да арганізацыі інтэлектуальнай дзейнасці старшакласнікаў. Яна мае рысы навуковага даследавання. Вучням прапануецца выканаць работы, выкарыстаўшы на выбар тры эпіграфы (у кожным закладзена праблема, якая патрабуе вырашэння).

“Як нельга схаваць у мяшку шыла, так нельга ў мастацкім творы скрыць таго, што з’яўляецца прадметам любові аўтара” (з пісьмаў Л.М. Талстога). Што любіць Уладзімір Караткевіч у “Каласах…”?

“Жыццё “прыдумаць” нельга. Яго можна толькі ўзнавіць. Такім, якім яно было, з усімі радасцямі і з усімі стратамі. З усімі ўспамінамі пра мінулае. З усім тым, што перажыў ты сам ці твае сябры, што перажылі, што адпакутавалі мае і вашы продкі. З той падсвядомасцю, што тоіцца ад іх у маёй і вашай душы. Таму ўсе мы – ад іх. Ад іхніх радасцяў, ад іхніх думак, ад усяго, чым яны жылі…” (У. Караткевіч).

“Мастацкі твор мёртвы, калі ён адлюстроўвае жыццё для таго толькі, каб адлюстроўваць жыццё, без усякага магутнага суб’ектыўнага намеру, … калі ён не ёсць пытанне або адказ на пытанне” (В.Р. Бялінскі) [28].

Работы, выкананыя навучэнцамі, умоўна можна падзяліць на тры групы. Адны работы носяць пераважна эмацыянальны характар. Навучэнцы з літаратурнымі здольнасцямі, уцягваючыся ў тэкст, імкнуцца “прысвоіць” аўтарскі сэнс *мастацкага* тэксту. Аўтары другіх работ імкнуцца асэнсаваць уласны асобасны вопыт (што перажыў аўтар праз суаднясенне з літаратурным вобразам). У разважаннях акрэсліваецца адзін з напрамкаў *я-ідэала* – уяўленне пра сябе як выканаўцу пэўнай сацыяльнай ролі, ролі творцы, духоўная сутнасць якой не павінна зведаць дэвальвацыі.Работы навучэнцаў трэцяй групы маюць пераканаўчую эмацыянальна-інтэлектуальную арыентаванасць, вылучаюцца маральна-этычнай ацэнкай прачытанага. Старшакласнікі пішуць: “Аб’ект адлюстравання У. Караткевіча – беларуская гісторыя, а значыць, твор не можа быць мёртвым, твораў мёртвых не бывае, а калі яны і ёсць, мне не хацелася б з імі сустракацца, твор У. Караткевіча ёсць жывое жыццё…, ён запаўняе белыя плямы ў нашай гісторыі, спалучае дакументальную праўдзівасць з вымыслам, узнаўляючы тым самым карціны перажыванняў, пакут і пошукаў сэнсу жыцця нашымі продкамі” [28].

## Дадатак 2. Табліца 1. Генезіс праблемы арганізацыі даследніцкай дзейнасці вучняў

Генезіс праблемы арганізацыі даследніцкай дзейнасці вучняў

| Часавы перыяд | Вядучыя накірункі распрацоўкі праблемы |
|---|---|
| XVIII – XIX ст.ст. | Зараджэнне ідэі арганізацыі самастойнай пошукавай дзейнасці вучняў, усталявання ўзаемасувязі паміж вучэбным матэрыялам і ўласным вопытам вучняў |
| 20 – 50-я гг. XX ст. | Унясенне прапановы выкарыстання вынікаў даследніцкай дзейнасці вучняў у сферах навукі і вытворчасці |
| 60 – 70- я гг. XX ст. | Выкарыстанне даследніцкага метаду як аднаго з метадаў праблемнага навучання; распрацоўка ідэі арганізацыі даследніцкай дзейнасці вучняў у пазаўрочны час |
| 80 – 90- я гг. XX ст. | Распрацоўка пытанняў: аб сензітыўнасці падлеткавага ўзросту для самапазнання, самаўдасканалення, правядзення даследаванняў; фарміраванні даследніцкай пазіцыі педагога; пабудове і рэалізацыі індывідуальнага адукацыйнага маршрута вучня-даследчыка |
| 2000 - я гг. XX ст. – да нашых дзён | 1) Разгляд сутнасці; зместу і функцый даследніцкай дзейнасці вучняў;<br>2) абмеркаванне пытання развіцця даследніцкай кампетэнтнасці вучняў; педагагічнага суправаджэння даследніцкай дзейнасці;<br>3) выказванне ідэі педагагічнага суправаджэння даследніцкай дзейнасці вучняў |

**Дадатак 3. Памятка “Лексічны аналіз тэксту”**

ПАМЯТКА “ЛЕКСІЧНЫ АНАЛІЗ ТЭКСТУ”

**Каб правесці лексічны аналіз, у тэксце неабходна знайсці:**

- ключавыя словы (словазлучэнні);
- словы, ужытыя ў пераносным значэнні;
- сінонімы, антонімы (у тым ліку кантэкстуальныя), амонімы;
- стылістычна афарбаваныя словы;
- запазычаныя словы, архаізмы, неалагізмы (у тым ліку, аўтарскія);
- прафесіяналізмы, дыялектызмы, фразеалагізмы;
- растлумачыць ролю гэтых лексічных з’яў у тэксце, іх прызначэнне, паказаць, *што* дасягаецца дзякуючы ім;
- удакладніць (з дапамогай слоўніка) значэнні шэрагу слоў; а калі слова мнагазначнае, то вызначыць, у якім значэнні яно ўжываецца ў тэксце;
- падабраць да пэўных слоў сінонімы, скласці сінанімічны рад, паказаць, чым адрозніваюцца словы-сінонімы, растлумачыць мэтазгоднасць выкарыстання аўтарам менавіта гэтых слоў;
- правесці назіранні над выкарыстаннем у тэксце лексічных паўтораў; асаблівую ўвагу звярнуць на тыя словы, якія ўжываюцца, паўтараючыся, у розных значэннях;
- паказаць, з дапамогай якіх лексічных сродкаў забяспечваецца ў тэксце сувязь паміж сказамі, абзацамі.

## Дадатак 4. Табліца 2.

## Этапы вучэбнага даследавання

Этапы вучэбнага даследавання

| Этапы работы | Мэты і задачы вучэбна-даследчай работы | Змест заняткаў |
|---|---|---|
| 1. Папярэдні | Дыягностыка ведаў, уменняў і навыкаў; вызначэнне сферы асабістых інтарэсаў вучняў | Пісьмовыя і вусныя заданні, пытанні, якія дапамогуць выявіць здольнасці і інтарэсы ўдзельнікаў даследчых работ, іх узровень валодання ведамі, уменнямі |
| 2. Выбар праблемы даследавання | Папярэдняя арыентацыя ў выбары праблемы даследавання | Абмеркаванне магчымых тэм даследавання (тэмы прапаноўвае настаўнік, улічваючы і тэматыку будучых канферэнцый, і асабістыя якасці вучняў) |
| 3. Вывучэнне навуковай літаратуры | Выпрацоўка практычных навыкаў работы з даведачнай і навуковай літаратурай | Складанне бібліяграфіі па тэме; розныя віды чытання, выдзяленне галоўнай думкі, канспектаванне, абмеркаванне прачытаных навуковых работ |
| 4. Фармулёўка аб’екта і прадмета даследавання, тэмы, гіпотэзы, пастаноўка мэты, задач, вызначэнне метадаў | Фарміраванне даследчыцкіх навыкаў (фармулёўка аб’екта і прадмета даследавання, тэмы, гіпотэзы, пастаноўка мэты, задач, вызначэнне метадаў у залежнасці ад мэты і задач даследавання) | Кансультацыі па пытаннях фармулёўкі аб’екта і прадмета даследавання, тэмы, гіпотэзы, разумення мэты і задач, па методыцы правядзення даследавання |
| 5. Збор матэрыялу | Навучанне збору матэрыялу ці пастаноўцы эксперыментаў | Збор матэрыялу, планаванне і правядзенне эксперыментаў |
| 6. Апрацоўка атрыманага матэрыялу | Навучанне статыстычнай апрацоўцы атрыманага матэрыялу і прадстўленню вынікаў у выглядзе табліц, дыяграм і г. д. | Апрацоўка атрыманага матэрыялу |
| 7. Фармулёўка вывадаў | Выпрацоўка ўмення фармуляваць вывады | Сістэматызацыя і абагульненне вынікаў работы |
| 8. Стварэнне тэксту вучэбна-даследчай работы | Практычнае авалоданне навуковым стылем, “згортванне” і “разгортванне” тэксту | Напісанне тэксту даследчай работы |
| 9. Прадстаўленне вынікаў работы | Авалоданне навыкамі вуснага публічнага выступлення | Прадстаўленне работы на навукова-практычных канферэнцыях і конкурсах |
| 10. Ацэнка работы | Рэфлексія на прадукт і вынік вучэбна-даследчай работы | Аналіз прапанаванай работы, абмеркаванне перспектыўных планаў |

**Дадатак 5. Практычныя вынікі даследчай дзейнасці настаўніка і вучняў “Вуліца Жалігоўскага”**

Вуліца Жалігоўскага ў горадзе Вілейцы
і мемарыяльная дошка на гэтай вуліцы
(устаноўлена па ініцыятыве Віктара Кажуры і Бажэны Мацюк)





## Дадатак 6. Практычныя вынікі даследчай дзейнасці настаўніка і вучня. Віктар Кажура, Бажэна Мацюк. “Тлумачальна-частотны слоўнік мовы зборніка “Вянок” Максіма Багдановіча” (фрагмент)

Віктар Кажура, Бажэна Мацюк.
“Тлумачальна-частотны слоўнік мовы зборніка “Вянок”
Максіма Багдановіча” (фрагмент)
Б (фрагмент)

Б (3). *гл.* бы

Багно (1). *Цяпер давольна топкае багно 138.*

Байніца (1). *Ў небе купалы, брамы, байніцы і шпіцы 96.*

Балота (6). *А тут яшчэ цераз балота Не прабярэшся да людзей 94. Хмары, балоты... Над збожжам убогім Вецер гуляе на волі 107. На цёмнай гладзі сонных луж балота... Закрасавалі чашачкі лілей 138.*

-:- Мн.: Н. 116; Р. 141; Т. 93.

Банк (1). *А дальш – за радам кас, ламбардаў, банкаў – Агні вакзала...97.*

Барада (1). *Мужык ідзе... З чупрынай белаю, як лунь, І з барадою снегавою 94.*

Баразна (1). *...сонца зайшло! Ярка-чырвоныя, жоўтыя, бурыя Боразны ў небе яно правяло 79.*

Бараніць (1). *...чаго жадалі мы тады, За што змагаліся, як баранілі веру 86.*

Бахматы (1). *Месяц белы заплаканы свеціць, Аглядае бахматыя зоркі 54.*

Бацька (2). 1. Тата. *А бацька сэрца хоць і меў, Ды прытуліць яе не ўмеў 148.*

2. У знач. паважлівага звароту да каго-н., чаго-н. *Прыпадыме бацька Нёман На хрыбце магутным лёд 73.*

Бацькоўскі (1). *А сэрца ўсё імкне да бацькоўскага краю 144.*

Бач (1). *ф. заг. ладу ад дзясл.* бачыць. Выкарыстоўваецца пры выражэнні абурэння, незадавальнення чым-н., здзіўлення. *Бач, на расе Хтось трапіў к збажжу ад крыніцы 94.*

Бачанае (1). *Наз. І бачанаму мной – я годны веры сведак 86.*

Бачыць (12). 1. Успрымаць зрокам. *Бачу я, з прыродай зліўшыся душой, Як дрыжаць ад ветру зоркі нада мной 62. І бачу я ў канцы няхітрую прыпіску 89. Пад снегам, - бачу твар вясны 110.*

2. Уяўляць у думках. *Бачу: сэрца не забыла 69. Бо бачыла адно душа, Як ты свяжа і хараша 151.*

Бег (1). *Наз. І волен лёгкіх санак бег 72.*

Бегчы (4). 1. Ліцца, цячы неперастанным патокам (2). *Хвалі ціха коцяцца і бягуць далёка 55. Гэтак часам уходзіць у землю крыніца, Дзесь у нетрах таемна бяжыць 149.*

2. Праходзіць, працякаць (пра час) (1). *Нячутна час кудысь бяжыць 149.*

3. *перан.* Узнікаць, цячы (пра думкі, пачуцці) (1). *Пачуццё з душы бяжыць 117.*

Бедненькі (1). *Ён, бедненькі, папоўз па траўцы ля сцяжынкі.*

Бедны (5). 1. Незаможны (2). *Так здаецца ў змроку ночы цёмным і народ мой родны, Бедны і няшчасны 115. Ой, чаму я стаў паэтам Ў нашай беднай старане ? 117.*

2. Які выклікае спачуванне да сябе; нешчаслівы (2). *Сэрца беднае заб’ецца 69. Там, дзе панура схілілась каліна, Беднага хлопца магіла 107.*

3. Танны, просты, небагаты (1). *Бедныя хаткі, таполі, бярозкі, Ўсюды панурыя людзі... 107.*

Без (10). *Прыназ. І бурлівая вада Снег, размоклы ў час адлігі, Змые з луга без сляда 73. Кажа, што нядоўга пажыву я, Што загіну без пары 82. Ён рынуўся туды без волі 125. Білі вакол перуны без упыну 193.Б*ез: 107, 111 (2), 121, 34 (2).

**Дадатак 7. Вынікі даследніцкай дзейнасці вучняў гімназіі па беларускай мове і літаратуры ў 2014 – 2016 г.г.**

1. Раённы конкурс (канферэнцыя) работ даследніцкага характару вучняў (2014 г. – дыпломаў I ступені – 1; 2015 г. – дыпломаў I ступені – 2, 2016 г. дыпломаў I ступені – 1, дыпломаў II ступені – 1).
2. Абласны этап конкурсу (канферэнцыі) работ даследніцкага характару вучняў (2014 г. – дыпломаў III ступені – 1; 2015 г. – дыпломаў III ступені – 1, 2016 г. – дыпломаў III ступені – 1).
3. Студэнцкая навукова-практычная канферэнцыя ў БДПУ імя М. Танка (2014 г. – дыпломаў – 2; 2015 г. – дыпломаў – 2).
4. Рэспубліканскі этап конкурсу (канферэнцыі) работ даследніцкага характару вучняў (2014 г. – дыплом I ступені – 1).
5. Міжрэгіянальная навукова-практычная канферэнцыя даследніцкіх работ вучняў “Шлях да вытокаў” (2014 г. – дыплом I ступені – 1; 2015 г. – дыплом I ступені – 1).
6. Міжнародны форум студэнцкай і вучнёўскай моладзі “Першы крок у навуку” (2014 г. – дыпломаў I ступені – 1, дыпломаў II ступені – 1; 2015 г. – дыпломаў I ступені – 2, дыпломаў II ступені – 1).
7. XXI – XXII юнацкія чытанні імя У. Вярнадскага (г. Масква) (2014 г. – дыплом I ступені – 1; 2014 г. – дыплом лаўрэата – 1; дыпломаў I ступені – 3, 2015 г. – дыплом I ступені – 1; 2016 г. – дыплом I ступені – 2).
8. Зборнік паэтычных апрацовак легенд і паданняў Вілейшчыны “Што ні куточак, то галасочак” (Мінск, “Конкурс”, 2013).
9. Зборнік даследчых работ вучняў “Сабе і людзям” (Мінск, МАІРА, 2008).
10. Адкрыццё памятнай дошкі на вуліцы Жалігоўскага ў Вілейцы.
11. “Тлумачальна-частотны слоўнік мовы зборніка “Вянок” М. Багдановіча” (рукапіс перададзены ў музей М. Багдановіча і выдавецтва БелЭн, 2016).

**Дадатак 8. Тэматыка даследніцкіх работ вучняў**

Тэматыка даследніцкіх работ вучняў:

а) літаратуразнаўчыя:

1) ”*Малавядомыя старонкі фалькларыстычнай спадчына Адама Гурыновіча*”,

2) “*Вобраз беларускай дзяўчыны пачатку XX-га стагоддзя ў творах Я. Купалы, Я. Коласа, М. Багдановіча*”,

*3)* “*Што ні куточак, то галасочак...*” *(тапаніміка Вілейшчыны ў паэтычных апрацоўках)*,

4) “*Вілейшчына літаратурная*”,

5) “*Карэспандэнты з Вілейшчыны на старонках "Нашай нівы" (1906 – 1908 гг.)*”,

6) “*Частотнасць ужывання лексічных адзінак мовы твораў зборніка “Вянок” Максіма Багдановіча як адлюстраванне мастацкага свету паэта*”,

7) “*Малавядомы факт з біяграфіі Янкі Купалы*”,

8) “*Малавядомы факт з біяграфіі Васіля Цяпінскага*”,

9) “*Увасабленне вобраза ракі Віліі ў творчасці сучасных паэтаў Вілейшчыны*”.

б) культуралагічныя:

10) *“Клыні – вёска маёй бабулі” (гістарычна-духоўная спадчына)*,

11) “*Ёсць такая вёска – Каранёва*”

в) мовазнаўчыя:

12) “*Тапонімы як адлюстраванне ўмоў жыцця людзей зніклых вёсак Вілейшчыны*”,

13) “*Тапонімы як сродак успрыняцця свету і адлюстравання ўмоў жыцця людзей*” *(на прыкладзе вёскі Порса Вілейскага раёна)*,

14) “*Уплыў часу на ўзнікненне гадонімаў горада Вілейкі”.*

# Дадатак 9. Папулярызацыя вопыту даследніцкай дзейнасці






**119.** Прачытайце верш. Якія літары трэба ўставіць у словы? Растлумачце правапіс ***е, ё — я***.

**Каб помнілі**

Ад дз..доў, ад прадз..даў,
ад в..коў сівых
нам у памяць дадз..на
слава дз..н былых.
Каб мы зналі-ведалі,
як даўней жылі,
над якімі бедамі
ўзрасці змаглі.
*В. Кажура*

Спішыце першы сказ, устаўляючы патрэбныя літары.

67






*Віктар Віктаравіч Кажура*

Памятаеце, спачатку было слова... Было яно і для Віктара Кажуры, калі ён выбіраў жыццёвы шлях. І гэта было слова настаўніцы беларускай мовы і літаратуры Карпавіцкай СШ Рэгіны Уладзіміраўны Чаеўскай.

— На сваёй памяці я не магу ўзгадаць у педагагічнай сферы людзей абыякавых, слабых, — расказвае В. В. Кажура. — Але яе методыка выкладання прадмета, уся ўласцівая заняткам атмасфера шчырасці і даверлівасці выразна адрозніваліся ў лепшы бок ад традыцыйна вытрыманых у акадэмічным духу ўрокаў іншых педагогаў.






**Вопыт развіцця творчых здольнасцей педагогаў, дзяцей і вучняў як інструмент паспяховай самарэалізацыі**

*Кажура Віктар Віктаравіч,*
*настаўнік беларускай мовы і літаратуры*
*ДУА «Вілейская гімназія № 2»*

Сёння адукаванасць чалавека вызначаецца не столькі спецыяльнымі (прадметнымі) ведамі, колькі яго рознабаковым развіццём як асобы, якая арыентуецца ў традыцыях айчыннай і сусветнай культуры, у сучаснай сістэме каштоўнасцей, асобы, здольнай да актыўнай сацыяльнай адаптацыі ў грамадстве і самастойнага жыццёвага выбару, самаадукацыі і самаўдасканалення. Таму адукацыйны працэс у школе павінен быць скіраваны не толькі на перадачу пэўных ведаў, уменняў і навыкаў, але і на шматпланавае развіццё дзіцяці, раскрыццё яго творчых магчымасцей, здольнасцей і такіх якасцей асобы, як ініцыятыўнасць, самастойнасць, фантазія, самабытнасць. Навучанне павінна фарміраваць пазнавальныя інтарэсы, развіваць здольнасці, заахвочваць да творчай дзейнасці.




**Малавядомы факт з біяграфіі Янкі Купалы**

***Грабоўская Аляксандра**, вучаніца 9 «Б» класа*
*ДУА «Вілейская гімназія № 2»*

*Кіраўнік*
***В. В. Кажура**, настаўнік беларускай мовы і літаратуры*
*ДУА «Вілейская гімназія № 2»*

**Уводзіны**

130 год мінула з таго часу, калі нарадзіўся Янка Купала. У першую чаргу ён вядомы нам як класік, паэт і драматург, адзін з пачынальнікаў новай беларускай літаратуры. Але значнае месца ў творчасці Янкі Купалы займае і публіцыстыка, якая «была для яго пярэднім краем барацьбы за ажыццяўленне ідэалаў працоўнага народа» [11, с. 509]. У яго публіцыстычнай спадчыне шмат твораў, напоўненых гуманізмам, непрымірымасцю да любых форм сацыяльнага і нацыянальнага прыгнёту.




**Краеведение как деятельностное средство воспитания юного исследователя**

*В. В. Кажуро*

Под «исследовательской деятельностью школьников» понимается такая форма организации воспитательно-образовательного процесса, при которой учащиеся ставятся в ситуацию, когда они самостоятельно овладевают понятиями и подходами к решению проблем в процессе познания, в большей или меньшей степени организованного (направляемого) учителем, решают творческие задачи с неизвестным заранее результатом. Именно исследовательский подход в обучении позволяет ребятам стать участниками творческого процесса, а не пассивными потребителями готовой информации.

Исследовательская деятельность позволяет развивать у ребенка умения и навыки для освоения стремительно нарастающего потока информации, ориентации в нем и систематизации материала.




**Арганізацыя даследчай дзейнасці вучняў у пазакласнай рабоце**

*Кажура Віктар Віктаравіч,*
*настаўнік беларускай мовы і літаратуры*
*ДУА «Вілейская гімназія № 2»*

На сучасным этапе магчымасці выкарыстання метадаў правядзення самастойных даследаванняў і стварэння вучнямі ўласных творчых вучэбных праектаў значна абмежаваны класна-ўрочнай сістэмай, вучэбнымі праграмамі і падручнікамі, у якіх прапануецца не вельмі вялікая колькасць задач даследчага характару. Пагэтаму педагогам неабходна самастойна шукаць шляхі развіцця даследчыцкіх навыкаў сваіх вучняў.

Першынство тут належыць пазаўрочнай дзейнасці, якая дазваляе фарміраваць у дзяцей такія ўменні і навыкі праз дзейнасць навуковых таварыстваў, факультатыўныя заняткі, удзел у конкурсах і канферэнцыях, адукацыйныя экспедыцыі, паходы і экскурсіі, вучэбна-даследчую дзейнасць як састаўную частку вучэбных праектаў.

Можна пагадзіцца з тымі настаўнікамі, якія прапануюць: